Айч. вайну са жн. 1941 да ліст. 1943 Л. акупіраваны ням.-фаш. захопнікамі. У 1959 — 505 ж. З 25.12.1962 у Рагачоўскім, з 6.1.1965 у Чачэрскім, з 30.7.1966 у Кармянскім р-нах. У 1962 да вёскі далучаны пас. Рагозны, у 1963 — пас. Калініна. У 1999 — 723 гаспадаркі, 1789 ж.

У 2013 дзіцячы сад, сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, мемар. музей П.М.Лепяшынскага, ФАП, аддз. сувязі, сталовая, 3 магазіны. Брацкая магіла сав. воінаў побач з вёскай, помнік П.М.Лепяшынскаму. Каля вёскі помнікі археалогіі — курганны могільнік і паселішча.

**ЛІЦЦЁ МАСТА́ЦКАЕ**, тэхніка стварэння мастацкіх вырабаў шляхам адліўкі расплаўленага металу ў форму, а таксама маст. творы, выкананыя гэтым спосабам; від *дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва*. Найб. пашыраны спосаб увасаблення ў метале твораў скульптуры, а таксама вырабу металічнага посуду, званоў, ювелірных упрыгажэнняў і інш. Зарадзілася ў эпоху асваення чалавекам спосабу здабычы і апрацоўкі металаў. З развіццём ліцейнай вытворчасці вылучылася ў асобную галіну. Маст. задачы вызначаюць спецыфічныя прыёмы фармоўкі мадэлі, метады ліцця, выбар металу або сплаву для пэўнага віду вырабу, дапрацоўку (часта аўтарскую) адлівак чаканкай, гравіраваннем, пацініроўкай, залачэннем і інш. На тэр. Беларусі Л.м. вядома з сярэдзіны 2-га тыс. да н.э. З бронзы, пазней і з жалеза адлівалі ўпрыгажэнні (спражкі, фібулы, пярсцёнкі), наканечнікі коп'яў і стрэл. Ліццё выконвалі ў нераздымных гліняных формах; з 12 ст. пашырыўся спосаб ліцця ў гліняныя ці каменныя раздымныя формы шматразовага выкарыстання. З медзі, бронзы, срэбра, зрэдку з золата адлівалі пярсцёнкі, спражкі, бранзалеты, амулеты, падвескі, царк. начынне (свяцільні, крыжы і інш.), дэталі адзення, конскай вупражы, зашчапкі для накладных кніжных пераплётаў, свінцовыя пячаткі, абразкі з гарэльефнымі сюжэтнымі вывамі і інш. Літыя ювелірныя вырабы аздаблялі *чаканкай, гравіраваннем, эмалямі*, чарненнем. Значнага развіцця і высокага маст. ўзроўню Л.м. дасягнула ў 16 — 17 ст. у сувязі з арганізацыяй у многіх гарадах (Мінск, Магілёў, Гродна, Нясвіж, Слуцк) цэхаў майстроў-металаапрацоўшчыкаў, куды ўваходзілі і ліцейшчыкі — людвісары (майстры па адліўцы гармат), канвісары (майстры па адліўцы званоў), алавяннікі, ювеліры і інш., якія выраблялі быт. рэчы, царк. начынне, ювелірныя ўпрыгажэнні і інш. У Полацку, Лагойску, Крычаве, Віцебску, Брэсце, Нясвіжы, Дзісне пашырылася ліццё званоў, аздобленых раслінным рэльефам і арнаментальнымі надпісамі (гл. *Дзісенскі звон*); у Магілёве, Брэсце, Мінску, Нясвіжы адлівалі гарматы з рэльефнымі пояскамі, гербамі, выявамі жывёл, анёлаў і інш. У 18 ст. ў месцах залягання балотных руд узніклі чыгуналіцейныя мануфактуры — у Гомелі, Вішневе (Валожынскі р-н), Кляцішчы (Стаўбцоўскі р-н), Бакштах (Іўеўскі р-н), Рудні (Слонімскі р-н) і інш., дзе выраблялі прадметы побыту, асвятляльныя і пісьмовыя прылады, надмагільныя крыжы і агароджы. У 19 ст. на чыгуналіцейных заводах у в. Старынка (Слаўгарадскі р-н), у Высокім (Аршанскі р-н), Горках, Гомелі адлівалі крыжы, укрыжаванні, рашоткі, агароджы, садовую мэблю, пячныя дзверцы, звёны мастоў і інш., прадметы ажурнага малюнка з пераплеценых раслінных парасткаў (дубовых галінак, вінаграднай лазы) ці з рэльефным дэкорам (выявы жывёл, маскаронаў, ваен. атрыбутаў). Многія вырабы дэманструюць уплыў маст. стыляў готыкі, барока, класіцызму. З 2-й пал. 19 ст. з развіццём металаапрацоўчай прам-сці Л.м. паступова занялала. У наш час бел. мастакі ствараюць у гэтай тэхніцы станковую скульптуру, мемар. і памятныя медалі, ювелірныя вырабы, працуюць майстэрні па адліўцы званоў.

*Літ.*: Сахута Я.М. Кляцішчанска-налібоцкае ліццё // Мастацтва Беларусі. 1989. № 6; Яго ж: Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Мінск, 2005.

*Я.М.Сахута.*

**ЛІЦЬВІ́НКА** Васіль Дзмітрыевіч (7.12.1941, в. Верхні Церабяжоў Столінскага р-на — 12.7.2007), беларускі фалькларыст, педагог. Канд. філал. навук (1984). Скончыў БДУ (1970). Настаўнічаў. З 1976 у БДУ (у 1982—2005 заг. лабараторыі). Адначасова ў 1978—2002 вёў тэлеперадачу «Запрашаем на вячоркі». Даследаваў абрадава-святочную культуру і фальклор беларусаў, гіст. эпас, рэгіянальныя асаблівасці традыц. маст. культуры Палесся. Распрацаваў канцэпцыю, арыентаваную на захаванне фалькл. і этнаграф. першакрыніц у галіне фалькларызму, прынцыпы і метады выкарыстання фалькл. спадчыны ў аматарскай дзейнасці фалькл. калектываў і інш. Аўтар кн. «Зімовыя святкі», «Веснавыя святы і абрады» (абедзве 1995), «Святы і абрады беларусаў» (2001). Адзін з аўтараў выд. «Беларускі фальклор у сучасных запісах» (1973), «Песня на ўсё жыццё» (1983). Складальнік зб-каў «Слова міма не ляціць» (1985, з Л.Царанковым), «Калыханкі і забаўлянкі» (1992), «Песня — душа народа» (1993), «Песні і строі Піншчыны» (1994, з М.Раманюком і У.Раговічам).

*Літ.*: Крыніца народнай мудрасці: з літ. спадчыны. Мінск, 2012.

*А.М.Аляхновіч.*

**ЛІЦЭ́Й** (ад грэч. Lykeion), сярэдняя агульнаадукацыйная навучальная ўстанова ў некаторых краінах Еўропы, Лац. Амерыкі, Афрыкі. У Рас. імперыі ў 19 — пач. 20 ст. саслоўная прывілеяваная сярэдняя або вышэйшая навуч. ўстанова для дзяцей дваран, якая рыхтавала дзярж. чыноўнікаў для ведамстваў, гал. чынам для Мін-ва ўнутр. спраў. Найб. вядомыя Л.: Царскасельскі (1811—1917; з 1844 Аляксандраўскі, пераведзены з Царскага Сяла ў Пецярбург), Дзямідаўскі ў Яраслаўлі (1803—1918), Рышэльеўскі ў Адэсе (1817—65), Крамянецкі (1819—34), Нежынскі (1820—75). Пасля 1917 ліквідаваны. У 1990 адро-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ